Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(63), 2010

*УДК 947.6*

# Заканадаўчая база аграрнай палітыкі польскіх улад у Заходняй Беларусі ў 1919-1925 гг.

В. П. Гарматны

## Уводзіны

Заканадаўчае афармленне аграрнай палітыкі польскіх улад у Заходняй Беларусі ў 1919-1925 гг. даволі слаба асветлена ў айчыннай гістарыяграфіі і разглядалася пераважна ў кантэксце агульных прац па развіцці сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі ў складзе Другой Рэчы Паспалітай. Сярод такіх прац трэба перш за ўсё адзначыць даследаванні Л. Гака [4], П. І. Зялінскага [7], Б. Я. Кухарава [9], І. В. Палуяна [10], А. А. Сарокіна [11], А. А. Цітовай [12, 13] і іншыя навуковыя працы. Сярод польскіх навукоўцаў азначанае пытанне знайшло сваё адлюстраванне ў працах С. Інглата [18], З. Ландау і Е. Тамашэўскага [20, 21], а таксама іншых гісторыкаў, але іх дзейнасць была накіравана перш за ўсё менавіта на разгляд рэалізацыі гэтых законаў, а не на іх распрацоўку.

У сучасны перыяд развіцця беларускай гістарычнай навукі дадзенаму пытанню прысвечаны працы гродзенскіх гісторыкаў А. Ф. Вырастка (Сцяпанавай) [3] і С. М. Грэся [6], але ў айчыннай гістарыяграфіі да гэтага часу адсутнічае комплекснае даследаванне заканадаўчай базы аграрнай палітыкі польскіх улад у Заходняй Беларусі ў 1919-1925 гг., таму дадзены артыкул з’яўляецца спробаю запоўніць гэты прабел.

## Асноўная частка

За гады Першай Сусветнай (1914-1918 гг.) і Савецка-польскай войнаў (1919-1921 гг.), якія працягваліся на тэрыторыі Беларусі няспынна амаль пяць гадоў, сельская гаспадарка краю была цалкам разбурана. Перад польскім урадам паўстала адна з асноўных задач – узняць з руін сельскую гаспадарку Заходняй Беларусі і забяспечыць прадуктовую бяспеку краіны. У кіруючых колах палітычных партый і ўрадавых сферах адроджанай Польшчы ішло актыўнае абмеркаванне разнастайных праектаў аграрнай палітыкі, у Сейме Другой Рэчы Паспалітай дзейнічала камісія аграрных рэформ [11, с. 59-60]. У 1919 г. з мэтаю правядзення планавых аграрных пераўтварэнняў польскімі ўладамі створана Галоўная земляўная ўправа (ГЗУ) [14, с. 131], пераутвораная ў 1923 г. у Міністэрства аграрных рэформаў.

На неабходнасць спалучэння аграрнай рэформы і каланізацыі “Крэсаў Усходніх” звяртала ўвагу сеймавых паслоў фракцыя Народна-Нацыянальны Саюза (ННС, ZLN, Związek Ludowo-Narodowy, “эндэцыя”), дасылаючы 9 красавіка 1919 г. маршалку Сейма Войцэху Тампчынскаму прапанову, у якой прадпісвалася магчымасць задавальнення патрабаванняў мясцовага насельніцтва ў залежнасці ад вызначэння лініі ўсходняй мяжы Польшчы. Пасол Ян Лютаслаўскі (ННС) выказваўся за неабходнасць правядзення на ўсходніх землях Другой Рэчы Паспалітай паланізацыі і адзначаў неабходнасць яе эвалюцыйнага характару, бо ў іншым выпадку яна можа ўзрушыць асновы існавання дзяржавы.

Фракцыя Польскай нацыянальнай партыі “Пяст” (ПНП-“Пяст”, PSL-“Piast”, “людаўцы”) падкрэслівала, што асноваю дзяржавы з’яўляецца сялянства і лічыла правядзенне аграрнай рэформы дзяржаўнаю і нацыянальнаю праблемаю, “вырашэнне якой пашырыць межы дзяржавы і ўзмоцніць польскае панаванне” [5, с. 97].

Яшчэ пад час Савецка-польскай вайны, 10 ліпеня 1919 г., у перыяд пад’ёму ў Польшчы рэвалюцыйнага руху, Сейм па прапанове ўрада Ігнацыя Яна Падэрэўскага пасля працяглай гарачай дыскусіі большасцю ўсяго ў адзін голас прыняў “Прынцыпы земляўнай рэформы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і адзяржаўлення лясоў" – першы закон па аграрным пытанні ў міжваеннай Польшчы [6, с. 3-4]. Паводле закону з свабодных ворных земляў, якія ў выніку войнаў засталіся без гаспадароў, уладамі ствараўся дзяржаўны земляўны фонд, праводзіліся выкуп і парцэляцыя (продаж зямлі невялікімі надзеламі – парцэлямі) часткі памешчыцкіх маёнткаў звыш вызначанага максіму валодання зямлі: для Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны гэты памер складаў 400 га, а для этнічнай Польшчы – 180 га. Уладальнікі высокапрадукцыйных насенных, жывёлагадоўчых, рыбных і іншых спецыялізаваных гаспадарак вызваляліся ад прымусовай парцэляцыі належачай ім зямлі [10, с. 33-34; 21, с. 13].

Дзеля правядзення парцэляцыі вызначаліся маёнткі, якія былі ўласнасцю дзяржавы; маёнткі, якія раней належалі членам дынастыі захопніцкіх дзяржаў, Рускаму сялянскаму банку, царкве і манастырам; маёнткі, набытыя пры дапамозе ліхвярства і земляўнай спекуляцыі, а таксама маёнткі альбо іх часткі, выкупленыя дзяржаваю ў прыватных уладальнікаў у прымусовым парадку па меры развіцця парцэляцыі [4, с. 6-7].

У першую чаргу парцэляцыі падлягалі маёнткі, якія былі разбураны пад час Першай сусветнай (1914-1918 гг.) і Савецка-польскай (1919-1921 гг.) войнаў і ўладальнік якіх не меў намеру аднаўляць гаспадарку, маёнткі з неўрэгуляваным пытаннем аб сервітутах і г. д. Маёнткі, якія знаходзіліся на нізкім узроўні сельскагаспадарчага развіцця і прыносілі страты (мала пастаўлялі на рынак прадуктаў), падлягалі парцэляцыі ў поўным памеры. Лес з парцэляваных маёнткаў поўнасцю адыходзіў ва ўласнасць дзяржавы.

Перш за ўсё пад час правядзення парцэляцыі зямлю атрымоўвалі батракі, што страцілі працу ў выніку ажыццяўлення аграрнай рэформы, затым былыя ўласнікі дробных і карлікавых гаспадарак, салдаты польскай арміі пасля вяртання з войска, а таксама беззямельныя і малаземляўныя сяляне, якія нічым іншым не займаюцца і для якіх зямля служыла асноўнаю крыніцаю існавання.

Закон прадугледжваў стварэнне новых хутароў і прырэзку зямлі карлікавым гаспадаркам, прычым агульная плошча надзела не павінна была перавышаць 25 маргоў (14 гектар). Кошт зямлі не вызначаўся, аднак мясцовым уладам пры вызначэнні кошту зямлі прадпісвалася прымаць пад увагу не толькі яе "вытворчую вартасць", але і вартасць пасеваў, меліярацыйныя работы і г. д. Уласнікі самастойных гаспадарак пры магчымасці ўносілі плату наяўнымі грашыма, а малаземляўныя маглі атрымаць ільготную дзяржаўную пазыку.

"Сейм спрабаваў заваяваць сялянства аграрнай рэформай", – пісаў вядомы дзяржаўны і палітычны дзеяч Другой Рэчы Паспалітай Вацлаў Студніцкі [11, с. 59]. Памешчыкі выступалі супраць пазбаўлення часткі сваіх земляў, так, напрыклад, на з'ездзе Камісіі польскіх Саюзаў Землеўладальнікаў Казімір Святаполк-Мірскі адзначыў: "Памешчыкі заўсёды выступалі супраць такога закону аб аграрнай рэформе, але гэта зусім не значыць, што яны выступалі супраць удасканалення аграрнай структуры дзяржавы" [17, с. 39].

Правыя партыі (ННС, PSChD-Партыя хрысціянскіх дэмакратаў і іншыя) выступілі супраць такога плану аграрнай рэформы і распачалі шырокую агітацыю супраць яго. Галоўнымі аргументамі правых сталі наступныя сцвярджэнні:

1) прымусовая парцэляцыя парушае права прыватнай уласнасці і супярэчыць з хрысціянскімі законамі;

2) у руках польскіх памешчыкаў няма такой колькасці зямлі, якой хапіла б на надзяленне ёю малаземляўных і беззямельных сялян;

3) аграрная рэформа, праведзеная на такіх умовах, магла б ліквідаваць паспяховыя асабістыя сельскія гаспадаркі, якія пастаўляюць сваю прадукцыю на экспарт;

4) правядзенне аграрнай рэформы і перш за ўсё парцэляцыі на "Крэсах Усходніх" магло б аслабіць эканамічную перавагу польскіх землеўласнікаў.

Правыя сцвярджалі, што такая аграрная рэформа магла б аслабіць сельскую гаспадарку і ў выніку падарваць эканоміку краіны. Контраргументы "людаўцаў" з ПНП-"Пяст" і ПНП-"Вызваленне" (PSL-"Wyzwolenie") былі наступнымі:

1) незалежная дзяржава не можа дазволіць сабе, каб тыя яе грамадзяне, што "жыватом і крывёю" баранілі яе, дыскрымінаваліся эканамічна і культурна;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2) эканамісты сцвярджалі, што сяляне з 1 га зямлі могуць даць прадуктаў больш, чым у экстэнсіўнай памешчыцкай гаспадрцы;

3) павышэнне заможнасці сялян станоўча паўплывае на іх пакупніцкую здольнасць, што дазволіць пасняхова развівацца прамысловасці;

4) на працягу 1919-1920 гг. "людаўцы" адзначалі небяспечныя пракамуністычныя настроі значнай часткі сялян, якія пакутавалі ад земляўнага голаду [19, с. 266].

Закон ад 10 ліпеня 1919 г. насіў дэкларатыўны характар, не быў апублікаваны ў дзяржаўным друкаваным органе "Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej" і таму не меў абавязковай сілы [7, с. 25], але асноўныя яго палажэнні атрымалі працяг у наступных законах польскіх улад па аграрным пытанні.

У планах аграрнай палітыкі на падставе прынятых Сеймам ІІ Рэчы Паспалітай законаў ад 7 мая 1920 г. [16, 1920, № 42] і 10 студзеня 1922 г. [16, 1922, № 10] прадугледжвалася ліквідацыя сервітутаў (сумеснага земляўнага карыстання сялян і памешчыкаў) дабраахвотным ці прымусовым шляхам у выпадку згоды аднаго з яго ўладальнікаў. Па закону "ліквідацыя сервітута павінна была кампенсавацца зямлёю ці наяўнымі грашыма толькі ў выпадку дамовы абодвух бакоў. Калі сервітуты ліквідаваліся прымусовым парадкам, то грашовая кампенсацыя дапускаецца толькі ў выглядзе выключэння, а менавіта: а) калі землі, абцяжараныя сервітутамі, ужо распарцэляваны на дробныя надзелы; б) калі ліквідаваныя сервітуты могуць быць заменены толькі лесам, які мае ахоўнае значэнне, ці плошча, занятая лесам, не прыдатна для выкарыстання пад ворныя землі" (артыкул 5).

Сяляне пазбаўляліся адвечнага права карыстацца агульнымі пастбішчамі, выганамі, збіраць у лесе грыбы і ягады, лавіць у рэках і азёрах рыбу і г. д. [9, с. 36]. За талон на права наведвання лесу з мэтаю збору грыбоў, ягад і нават моху вяскоўцы вымушаны былі плаціць па 2-3 і больш злотых. Калі ляснік лавіў селяніна ў лесе без такога талона, то земляроб павінен быў заплаціць вялікі штраф. Варта адзначыць, што сяляне знайшлі выйсце з гэтай сітуацыі: яны куплялі сумесна на вёску некалькі талонаў і хадзілі ў лес па чарзе.

15 ліпеня 1920 г. пад час найбольшай небяспекі для існавання Польскай дзяржавы, калі Чырвоная Армія падышла да сцен Варшавы, Сейм нават без абмеркавання, адзінагалосна адобрыў больш радыкальны закон па ажыццяўленні аграрнай палітыкі: "Выканаўчыя правілы да закону аб земляўнай рэформы ад 10 ліпеня 1919 г. " [16, 1920, № 70; 20, с. 290], які утрымліваў асноўныя пастановы папярэдняга закону. Сейм заклікаў урад абвясціць па ўсіх паветах, што ўсе, хто ўхіляецца ад абавязкаў вайсковай службы і прызыву, пазбаўляецца права на атрыманне ў будучым надзела зямлі і карыстання прынятым законам.

Закон аб аграрнай рэформе складаўся з трох частак: папершай вызначалася, якія землі выдзяляюцца на правядзенне парцэляцыі і як грамадства будзе імі распараджацца; другая частка акрэслівала, якім спосабам будзе ажыццяўляцца выкуп парцэляванай зямлі; паводле трэцяй тлумачылася, як і на якіх умовах будзе падзелена парцэляваная зямля [15, с. 3]. Закон прадугледжваў надзяленне зямлёю малаземляўных і беззямляўных сялян праз выкуп яе за палову рынкавага кошту: 80% утвараемага земляўнага фонду вызначалася менавіта для іх. Першынства ў набыцці на "Крэсах Усходніх" зямлі адводзілася інвалідам вайны, сельскагаспадарчым рабочым і малаземляўным сялянам, якім польскім урадам выдаваліся праз Сельскагаспадарчы банк ільготныя крэдыты [14, с. 131; 22, р. 131].

17 снежня 1920 г. Сейм ІІ Рэчы Паспалітай па прапанове ўрада на чале з Вінцэнтам Вітасам (лідар ПНП-"Пяст") прыняў закон аб вайсковым асадніцтве (асаднікі – каланісты-перасяленцы з карэннай Польшчы) [16, 1921, № 4]. Гэты закон падзяляўся на дзве часткі, якія папаўнялі адна адну і складалі непарыўнае адзінства: першая з іх вызначала парадак надзялення зямлёю дабраахвотнікаў і заслужаных салдат польскай арміі, паводле другой – пачынаў існаваць асобны земляўны фонд з плошчаў на ўсходніх землях Другой Рэчы Паспалітай [3, с. 235-236; 25, с. 27-30]. Дзеля правядзення мерапрыемстваў па надзяленні асаднікаў зямлёю ствараліся спецыяльныя камітэты, у абавязак якіх уваходзіла ўзаемадзеянне з адказнымі за выкананне закону органамі ўлады – Міністэрствам спраў вайсковых, ГЗУ і Міністэрствам сельскай гаспадаркі і дзяржаўных маёмасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Памер аплаты за зямлю быў прыроўнены да 30-100 кг збожжа за 1 га штогод з выплатай дзяржаве на працягу 30 гадоў, пачынаючы з пятага года пасля атрымання зямлі (артыкулы 3 і 7). Інваліды і заслужаныя салдаты польскай арміі маглі атрымаць ад дзяржавы доўгатэрміновыя крэдыты з іпатэчным забеспячэннем. Дзяржава аказвала дапамогу натураю або грашыма для абзавядзення гаспадаркай. На гаспадарку адводзілася 80 м$^3$ будматэрыялаў і 2 000 000 марак грашыма, інвентаром або збожжам (артыкул 5 і 8). Пры дэмабілізацыі асаднік атрымоўваў воз з канём і вупраждку. Асаднік павінен быў пасяліцца на сваім водрубе на працягу года і ў трохгадовы перыяд асвоіць яго. Створаныя асадніцкія гаспадаркі не маглі быць падзелены (артыкул 10), прададзены без згоды Галоўнай земляўнай управы на працягу 25 гадоў ад даты іх атрымання (артыкул 33). Зямля, якая не апрацоўвалася кандыдатам у асаднікі на працягу 3 гадоў, магла быць перададзена іншаму прэтэндэнту.

Грашовая ўзнагарода за адчужэнне ў дзяржаўны фонд зямлі ўсталёўвалася ўладамі ў палову, а прадавалася сялянам па поўным рынкавым кошце. Закон ад 15 ліпеня 1920 г. пакідаў за памешчыкамі права звяртацца ў суд са скаргаю на рашэнні земляўных органаў, таму пасля заканчэння Савецка-польскай вайны суды ў многіх выпадках прызнавалі страту паловы рынкавага кошту зямлі парушэннем правоў прыватнай уласнасці, што абвастрыла ў краіне аграрнае пытанне [1, с. 28; 11, с. 71].

З маёнткаў, за якія выплачвалася звыш 500 тысяч марак, утрымлівалася ад 5 да 30% кошту ў фонд надзелу зямлёю бяднейшых сялян, інвалідаў і заслужаных вайскоўцаў. Аплату былыя ўласнікі зямлі атрымоўвалі не наяўнымі грашыма, а чатырохпрацэнтнымі часовымі распіскамі, якія ў будучым павінны быць кампенсаваны чатырохпрацэнтнаю дзяржаўнаю рэнтай. Асобам, якія атрымоўвалі парцэлы (земляўныя надзелы), дзяржава выдавала праз Сельгасбанк доўгатэрміновую пазыку, а інваліды і салдаты польскай арміі атрымоўвалі зямлю бясплатна [7, с. 26].

Паводле прынятага закону ўсе бежанцы-беларусы, што не паспеюць вярнуцца дадому да 1 красавіка 1921 г., пазбаўляюцца сваіх надзелаў, а на гэтых землях польскі ўрад планаваў таксама пасяліць вайсковых і цывільных асаднікаў [22, р. 132], але на практыцы гэты закон вельмі часта не выконваўся: мясцовыя ўлады часцей за ўсё перадавалі зямлю і тым сялянам, якія вярнуліся дадому пасля азначанага тэрміну.

Ацэньваючы прыняты закон, пасол Ян Домбскі (ПНП-"Пяст") падкрэсліў, што "ён (закон) імкнецца вырашыць тры пытанні: каланізацыю ўсходніх земляў, надзяленне зямлёю польскіх салдат і асваенне кінутых земляў". Далей Домбскі пісаў: "Я ўпэўнены, што спакойны беларускі селянін не будзе мець нічога супраць таго, каб зямля, якую ён сам не можа абрабіць, будзе аддадзена польскаму салдату, тая зямля, якую ён абараняў ад бальшавіцкага нападу. Я моцна веру, што малаземляўны або беззямельны селянін будзе таксама не прымацца пад увагу і не будзе пакрыўджаны" [5, с. 97].

У першай Канстытуцыі Другой Рэчы Паспалітай ад 17 сакавіка 1921 г. аграрная рэформа ніяк не ўпаміналася, але падкрэслівалася неабходнасць змянення аграрнага ладу краіны і адначасова зацвярджалася недатыкальнасць любой прыватнай земляўнай уласнасці (артыкул 99), што ставіла пад сумненне адпаведнасць Канстытуцыі прынятага закону аб аграрнай рэформе, таму на практыцы быў ажыццёўлены зусім іншы праект рэформы – больш кансерватыўны, але прыдатны для ажыццяўлення. Такім чынам, Канстытуцыя значна абмежавала парцэляцыю зямлі і зрабіла невыконваемай пастанову аграрнага закону аб выкупных выплатах [8, с. 36; 12, с. 2].

У выніку падпісання 18 сакавіка 1921 г. Рыжскай мірнай дамовы амаль палова беларускіх земляў апынулася ў складзе Польшчы, на гэтыя землі польскія ўлады пачалі перасяляць вайсковых і цывільных асаднікаў (перасяленцаў-каланістаў з карэннай Польшчы). У распараджэнні старшыні ГЗУ ад 23 сакавіка 1921 г. тлумачылася, каго закон разумеў пад салдатамі польскай арміі: гэта радавыя, афіцэры, генералы, служачыя польскай арміі і падраздзяленняў добраахвотнікі (апалчэнцы), якія неслі вайсковую службу не менш чатыры месяцы – усе яны мелі права на бясплатнае надзяленне зямлёю. Згодна з законам не маглі атрымаць зямлі салдаты, якія былі пакараны за злачынствы супраць узброеных сіл польскай дзяржавы ці самавольна бралі ў карыстанне чужыя землі [11, с. 68-69].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Погляды "людаўцаў" Вінцэнта Вітаса і "эндэкаў" Рамана Дмоўскага на аграрную рэформу не супадалі, з-за чаго ім не ўдалося стварыць кааліцыі ў Сейме 1922 г. Свае супярэчнасці польскія палітыкі змаглі вырашыць 13 мая 1923 г. на сустрэчы ў Ланцкароне, у маёнтку сенатара Людвіка Гамерлінга, дзе яны заключалі часовы і даволі нетрывалы кампраміс (так званы "Ланцкаронскі пакт") [14, с. 131; 19, с. 268].

У плане правядзення рэформы прадугледжвалася камасацыя (ліквідацыя цераспалосіцы), што азначала правядзенне хутарызацыі. 31 ліпеня 1923 г. польскім Сеймам прыняты закон аб камасацыі [23, с. 447]. Сяляне павінны былі плаціць за хутарызацыю кожнага гектара зямлі ў залежнасці ад яе якасці ад 14 да 20 злотых, за складанне праектаў меліярацыі, утрыманне землеўпарадчыкаў, перанясенне дарог і г. д., таму камасацыя першапачаткова праходзіла даволі марудна.

У снежні 1924 г. урад Уладзіслава Грабскага (ННС) выступіў з новым законапраектам па аграрным пытанні, па якім прадугледжвалася адчужэнне без выкупу памешчыцкіх земляў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на карысць вайсковых і грамадзянскіх асаднікаў [9, с. 29]. 26 ліпеня 1925 г. Сейм Другой Рэчы Паспалітай пры падтрымцы праўрадавых партый ППС (PPS, Польскай Партыі Сацыялістычнай) і ПНП-"Вызваленне" адхіліў законапраект левых і прыняў "Закон аб правядзенні земляўнай рэформы" [18, с. 215], які ўвайшоў у гістарыяграфію як "Закон аб парцэляцыі і асадніцтве".

28 снежня 1925 г. Сейм ІІ Рэчы Паспалітай прыняў канчатковы варыянт аграрнай рэформы [16, 1926, № 1], распрацаваны на базе "Ланцкаронскага пакту" (май 1923 г.). Новы закон фактычна адмяніў земляўную рэформу 1920 г. і стаў асноваю далейшай аграрнай палітыкі. Аграрная рэформа складалася з насаджэння вайсковага і цывільнага асадніцтва, ажыццяўлення парцэляцыі, правядзення камасацыі і ліквідацыі сервітутаў. Закон афіцыйна замацаваў механізм продажу памешчыкамі часткі сваіх земляў. Парцэляцыя павінна была праходзіць дабраахвотна, але не бясплатна – разглядаемы закон дапушчаў магчымасць адчужэння прыватных земляў праз выкуп па кошце, вызначаным урадам, прадугледжваў пашырэнне прывілеяў памешчыкаў і свабодны продаж зямлі па рынкавым кошце [13, с. 274; 24, с. 11-24]. Памешчык меў права самастойна выбіраць надзел зямлі пад правядзенне парцэляцыі – зразумела, што гэта была зямля горшай якасці. Законам прадугледжвалася парцэляцыя 200 000 га зямлі штогод (на працягу першых дзесяці гадоў). Калі на працягу года ў краіне прадавалася менш за 200 000 га памешчыцкай зямлі, то дзяржава прымусова пускала на продаж частку земляў буйных маёнткаў па рынкаваму кошце, каб сяляне набывалі штогод не менш за 200 000 га. Парцэляваныя надзелы прадаваліся надзеламі да 15 га ў вялікапольскіх землях і да 26 га ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне [1, с. 28; 11, с. 135].

Памешчыкі захоўвалі земляўны надзел у памеры 60 га ў раёне буйных гарадоў, а ў іншых раёнах Польшчы гэты памер складаў 180 га. У сувязі з тым, што на "Крэсах" гаспадарка была больш экстэнсіўная і польскія памешчыкі разглядаліся ў якасці апоры цэнтральнай улады, то тут максімум складаў 400 га (калі маёнтак меў прадпрыемствы для перапрацоўкі сельгаспрадукцыі, то максімум павялічваўся да 1 000 га). Такім чынам памешчыкі ўцягваліся ў капіталістычныя адносіны, а парцэляцыя разам з тым дапамагала заможным сялянам ствараць фермерскія гаспадаркі [2, с. 26; 20, с. 302].

Казімір Святаполк-Мірскі ад імя памешчыкаў Польшчы крытыкаваў прыняты закон і адзначаў, што "Закон аб аграрнай рэформе ўводзіць у аграрную праблематыку штучныя элементы, якія вынікаюць адзінкава з імкнення да колькаснага вырашэння аграрнага пытання – механічнага надзялення як мага большай колькасці людзей зямлёю, а не якаснага, гэта значыць стварэння здаровай аграрнай структуры, якая б абапіралася на разнастайныя тыпы сельскай гаспадаркі. Такім чынам, у якасці нездаровай аграрнай структуры трэба прызнаць павелічэнне і замацаванне тыпа вегетатыўнай і несамастойнай гаспадаркі" [17, с. 41].

## Заключэнне

Такім чынам, аграрная палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі ў 1919-1925 гг. ажыццяўлялася перш за ўсё на падставе законаў, прынятых Сеймам Другой Рэчы Паспалітай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

10 ліпеня 1919 г., 7 мая 1920 г., 15 ліпеня 1920 г., 17 снежня 1920 г., 10 студзеня 1922 г., 31 ліпеня 1923 г. і 26 ліпеня 1925 г. Польскімі ўладамі быў абраны прускі шлях развіцця капіталізму ў вёсцы, гэта значыць з захаваннем буйнога памешчыцкага землеўладання і выкупам сялянамі зямлі за грошы.

Заканадаўчая база аграрнай палітыкі была дэталёва распрацавана на працягу 1919-1925 гг. Сеймам і польскімі дзяржаўцамі і дапоўнена ў наступныя гады неабходнымі ўдакладняючымі пастановамі, але сама рэформа ў сувязі з пачаткам 1 верасня 1939 г. Другой Сусветнай вайны не была праведзена да канца і таму не змагла вырашыць аграрнага пытання ў міжваеннай Польшчы.

**Резюме.** Статья посвящена законодательной базе аграрной политики польских властей в Западной Белоруссии в 1919-1925 гг.

**Abstract:** The article tells about the formation of legislative basic agrarian reform Polish authorities in Western Belarus in 1919-1925.

**Літаратура**

1 Аграрный вопрос и крестьянское движение. Справочник. Том второй / Под ред. М. П. Горова. – Москва, Международный аграрный институт, 1936. – 198 с.

2. Броўкін, Я. А. Эканоміка Польшчы ў 1921-1929 гг. / Я. А. Броўкін // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 3. – С. 25-31.

3 Вырастка, А. Ф. Выпрацоўка заканадаўства аб асадніцтве ў ІІ Рэчы Паспалітай і яго рэалізацыя / А. Ф. Вырастка // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навуковых артыкулаў / Гродна, ГрДУ, 2006. – 422 с. – С. 232-237.

4 Гак, Л. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі / Л. Гак. – Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Партмассектар, 1933. – 95 с.

5 Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918-1922 гг.) / К. Гамулка. – Вільня, ЕГУ, 2008. – 256 с.

6 Грэсь, С. М. Законы аб аграрнай рэформе 1919-1925 гг., іх распрацоўка і прыняцце ў Сейме і Сенаце / С. М. Грэсь // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. – 2007. – № 4. – С. 3-7.

7 Зялінскі, П. І. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919-1939 гг.) / П. І. Зялінскі // Праблемы ўз`яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі 17-18 верасня 1999 года, Мінск, БДУ. – Мінск, БДУ, 2000. – С. 24-30.

8 Канстытуцыя Польскае Рэспублікі 17 сакавіка 1921 г. і Закон 20 студня 1920 г. аб польскім грамадзянстве. – Вільня, Друк С. Бэхэра, 1924. – 102 с.

9 Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Минск, Вышэйшая школа, 1975. – 112 с.

10 Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929-1933 гг. / И. В. Полуян. – Минск, Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.

11 Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск, Наука и техника, 1968. – 204 с.

12 Титова, А. А. Позиции польских политических партий по вопросу аграрной реформы в 1922-1925 гг. : автореф. дисс. на соискание степени канд. ист. наук / А. А. Титова. – Москва, МГУ, 1977. – 26 с.

13 Цітова, А. Беларускі дэпутацкі клуб і праблема аграрнай рэформы ў польскім Сейме ў 1922-1935 гг. / А. Цітова // Беларусіка-Albaruthenika: Кн. 3. Нацыянальныя і рэлігійныя культуры, іх узаемадзеянне. Мінск, Навука і тэхніка, 1994. – 432 с. – С. 269-276.

14 Brzoza, Cz. Polska w czasach niepodleglosci i Drugiej Wojny Swiatowej (1918-1945) / Cz. Brzoza. – Krakow, Fogra, 2001. – 424 s.

15 Dabrowska, M. O wykonaniu reformy rolnej (objasnienie ustawy z d. 15 lipca 1920 r.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

wraz z urzedowym tekstem ustawy i przepisow wykonawczych) / M. Dabrowska. – Warszawa, Druk Ksiegarna Rolnicza F. Wyszynskiego i S-ki, 1921. – 102 s.

16 Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej – Warszawa, Kancelaria Prezesa Rady Ministrow, 1919-1939.

17 Galka, B. W. Miejsce i rola ziemianstwa w strukturze spoleczno-economicznej II Rzeczypospolitej. Zarys problematyki / B. W. Galka // Dzieje Najnowsze. – 1985. – № 1. – S. 33-52.

18 Historia chlopow polskich / pod redakcja Stefana Inglota. – Wroclaw, Wydawnictwo Uniwersytetu Wroclawskiego, 1995. – 395 s.

19 Jezierska, A., Leszczynska, C. Historia gospodarcza Polski / A. Jezierska. – Warszawa, Key Text, 1999. – 560 s.

20 Kostrowicka, I., Landau, Z., Tomaszewski, J. Historia gospodarcza Polski XIX i XX wieku / I. Kostrowicka. – Warszawa, Ksiaska i Wiedza, 1975. – 590 s.

21 Landau, Z., Tomaszewski, J. Gospodarka Drugiej Rzeczypospolitej / Z. Landau // Dzieje Narodu i Panstwa Polskiego. – 1991. – № 3. – S. 1-80;

22 Lubachko, I. S. Belorussia under Soviet rule. 1917-1957 / I. S. Lubachko. – Lexington, The University press of Kentucky, 1972. – 220 p.

23 Odlanicki-Poczobutt, St. Wojewodztwo Nowogrodzkie / St. Odlanicki-Poczobutt. – Wilno, Nakladem Wilenskiej Izby Rolniczej, 1936. – 498 s.

24 Sprawozdanie stenograficzne z 263 posiedzenja Sejmu Rzeczypospolitej z dnia 28 grudnia 1925 r. – [Warszawa], 1925. – 40 s. – S. 11-24, 35-40.

25 Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – Warszawa, Instytut studiow politycznych PAN oficyna wydawnicza RYTM, 2003. – 431 s.

Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт Поступило 23.02.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ